# КАМІЛА АСІПОВІЧ: МУЗЫКАНТ, ПЕДАГОГ, БАРАЦЬБІТ

## Жыццёвы шлях і рэвалюцыйна-асветніцкая дзейнасць дачкі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча

**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар



**Год назад выдавецтва «Беларуская навука» выпусціла ў свет цудоўную кнігу «Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: анталогія». Яе ўкладальнікі (К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч) уключылі ў зборнік не толькі ўсе асноўныя творы беларускіх пісьменнікаў з папярэдніх анталогій, але і, што вельмі карысна, папоўнілі яе новымі, адшуканымі ў апошні час творамі беларускіх аўтараў. Змешчаны тут таксама біяграфічныя артыкулы пра пісьменнікаў і каментарыі да іх твораў. У бібліяграфічным артыкуле, прысвечаным Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, адзначаецца, што ён прымаў удзел у паўстанні 1863–1864 гг. І ў гэтым кантэксце паведамляецца: «Вялікую актыўнасць у паўстанні праявіла яго дачка Каміла, якая была саслана ў Сібір» [9, с. 379].**

**Мяне зацікавіла асоба дачкі знакамітага пісьменніка, і я пачаў збіраць матэрыялы аб ёй. Паступова перада мной паўстаў цэльны вобраз гэтай таленавітай, самаахвярнай, мужнай, адданай свайму народу жанчыны.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Дзяўчынка-вундэркінд

Вельмі рана ў Камілы (1837–1885) праявіліся незвычайныя музычныя здольнасці. Ужо ў чатырохгадовым узросце яна ўдзельнічала ў хатніх музычных вечарах, якія часта ладзіліся ў доме пісьменніка. Фартэпіяннае выкананне юнай піяністкай складаных твораў уразіла славутага Станіслава Манюшку, сябра бацькі дзяўчынкі. Кампазітар параіў Дуніну-Марцінкевічу заняцца музычнай адукацыяй дачкі і парэкамендаваў настаўніка музыкі. Дамінік Стэфановіч (1797–1871) у свой час быў настаўнікам самога Манюшкі. Польскі музыказнаўца М. Фукс адзначаў, што менавіта пад уплывам Д. Стэфановіча фарміраваўся музычны густ славутага ў будучым кампазітара.

Праслухаўшы Камілу, Стэфановіч з ахвотай пагадзіўся займацца з таленавітай дзяўчынкай. За тры гады ён не толькі прыкметна ўдасканаліў тэхніку ігры на фартэпіяна сваёй падапечнай, але і прывіў Каміле навыкі прафесійнага выканальніцтва. У выніку ўжо ў васьмігадовым узросце Каміла пачала выступаць з публічнымі канцэртамі перад мінскай публікай, падчас якіх выконвала даволі складаныя музычныя творы. Газета «Минские губернские





ведомости» пісала ў 1847 г.: «Самый выбор, каков фортепианный Концерт Гуммеля, как-то гармонировал ее крошечным пальчикам, с удивительной быстротою порхавшим по клавишам рояля. Можно утвердительно сказать, что музыка для очаровательной малютки Марцинкевич – та стихия, в которой талант ее расцветает со всей прелестью».

У тым жа годзе віртуозная піяністка ўпершыню выступіла разам з малодшым братам Міраславам з канцэртамі ў Вільні. З гэтай нагоды газета «Виленские губернские ведомости» пісала: «... Камила играла с удивительной ловкостью и отчетливостью первое аллегро концерта Гуммеля и фантазию Шопена, с непонятным для дитяти искусством и соблюдением всех малейших оттенков сей возвышенной и вместе с тем трогательной музыки». З поспехам прайшлі музычныя канцэрты юных віртуозаў у шэрагу беларускіх гарадоў. Да гэтага ж перыяду адносяцца і першыя кампазітарскія спробы таленавітай піяністкі: дзве мазуркі, полька і «Малітва», якія ў 1845 г. былі выдадзены ў Мінску.

У 1849 і 1850 г. беларускія вундэркінды даюць канцэрты ў Кіеве і Варшаве. Выступленні сястры і брата Марцінкевічаў выклікалі захапленне публікі і ўзнёслыя ацэнкі музыказнаўцаў. Газета «Киевские губернские ведомости» адзначала: «...Их слушаешь уже не как детей, но искусных исполнителей. От начала до конца везде выдержка; отчетливость звуков и беглость пальчиков нимало не уступают отчетливости и беглости в игре музыкантов, уже долго занимающихся своим искусством» [9]. Чысціню апрацоўкі, разважлівасць, сілу энергіі ў ігры Камілы і Міраслава падкрэсліваў і польскі музычны крытык Ю. Сікорскі.

Разам з тым канцэрты юных беларускіх выканаўцаў, якія з поспехам прайшлі ў многіх гарадах Расійскай імперыі, паказалі, што гэтым таленавітым маладым людзям не хапае кансерваторскай адукацыі. С. Манюшка і Д. Стэфановіч, якія ўважліва сачылі за канцэртнай дзейнасцю абодвух віртуозаў, настойліва раілі В. Дуніну-Марцінкевічу накіраваць дачку і сына для завяршэння адукацыі ў Парыжскую кансерваторыю. Вучоба ў Парыжы патрабавала вялікіх сродкаў. Фальварак пісьменніка Люцынка не прыносіў такога прыбытку, які дазволіў бы аплаціць навучанне дзяцей за мяжой. Сябры паралі Вінцэнту звярнуцца па дапамогу да цара Мікалая І. Аднак цар у дапамозе адмовіў. Была яшчэ надзея на вялікага князя (будучага імператара Аляксандра ІІ), які лічыўся аматарам і апекуном прыгожага мастацтва. У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захаваўся зварот пісьменніка да вялікага князя: «...Опасаясь, чтобы по причине недостатка не затратить в забвении два таких блестящих таланта, я ныне отдаю детей под покровительство его императорского высочества наследника престола, всепокорнейше прося, чтобы по милости своей велел отпустить на дорогу за границу и на содержание детей в Париже какую сумму... Ныне слава и участь детей-артистов находится в руках вашего превосходительства, а благородное сердце ваше легко угадает, с каким страхом мы ожидаем решения оных» [2]. Сапраўды, сям'я пісьменніка і яго сябры з нецярплівасцю чакалі рашэння наследніка. Але і ён не палічыў неабходным падтрымаць таленавітых беларускіх музыкантаў.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Міраслаў і асабліва Каміла з горыччу ўспрынялі адмову на просьбу бацькі. Выхаваная ў атмасферы высокай маральнасці, не загартаваная жыццёвымі нягодамі дзяўчына атрымала глыбокі псіхалагічны стрэс. У знак пратэсту яна катэгарычна адхіляла шматлікія прапановы аб удзеле ў публічных канцэртах і музіцыравала толькі ў коле блізкіх сяброў. Так, па сведчанні М. Багадзяжа, у 1852 г. яна ўдзельнічала ў паказе ў Мінску першай беларускай оперы «Сялянка» (музыка С. Манюшкі, лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча) [1, с. 81]. Першае прадстаўленне оперы адбылося ў тэатральным памяшканні атэля Аўсея Паляка, дзе цяпер знаходзіцца правае крыло Беларускай акадэміі музыкі. Ролю Навума Прыгаворкі ў спектаклі выконваў сам пісьменнік, а адну з сялянак іграла Каміла. Ёсць меркаванні, што Каміла ўваходзіла таксама ў тэатральную трупу бацькі.

Удзел у спектаклі не быў выпадковым эпізодам у жыцці гэтай таленавітай дзяўчыны. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у сваім маёнтку Люцынка стварыў аматарскі тэатр, у якім выконваліся яго п'есы. Са сцэны гучала сапраўдная, жывая

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

беларуская мова, рэпертуар вызначаўся сацыяльнай накіраванасцю. Каміла цалкам падтрымлівае пачынанні свайго бацькі. Яна рэжысіруе, іграе ў спектаклях, займаецца пастаноўкай дзіцячых п'ес, якія пісаў В. Дунін-Марцінкевіч. Праз нейкі час, перамогшы дэпрэсію, мужная дзяўчына аднаўляе працу па ўдасканаленні выканальніцкага майстэрства. Увесь вольны час яна прысвячае ігры на фартэпіяна, а таксама займаецца кампазіцыяй. Музыказнаўцы прыгадваюць яе фантазію «Reve du passé» (1861 г.) для фартэпіяна, прысвечаную графіні Марыі Тышкевіч (ноты пакуль не знойдзены).

## Настаўніца-добраахвотніца

У гэты ж перыяд Каміла пачынае актыўна займацца педагагічнай дзейнасцю. Пераканаўшыся на ўласным вопыце, як важна, каб творчыя задаткі дзіцяці былі своечасова заўважаны і развіты, яна навучае ігры на фартэпіяна музычна адораных дзяцей сваіх аднадумцаў. Беларускі журналіст і паэт Адам Плуг (1823–1903), сябар сям'і В. Дуніна-Марцінкевіча, адзначаў, што Каміла была не толькі здольнай піяністкай, але і выдатнай настаўніцай музыкі [10, с. 374]. Акрамя таго, вядома, што на пачатку 1860-х гадоў яна арганізавала ў Мінску і ў мястэчку Гарадок Маладзечанскага павета школы для дзяцей беднаты.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захоўваюцца шматлікія дакументы, якія датычаць грамадска-палітычнай дзейнасці Камілы. У адным з іх занатавана, што дзяцей незаможных жыхароў горада настаўніца-добраахвотніца навучала на сваёй кватэры пад пільным наглядам паліцыі. Дзяўчыну абавязалі па ўстаноўленай паліцыяй форме рэгулярна прадстаўляць гарадскім уладам інфармацыю аб змесце і выніках навучання. Абмяжоўвалася колькасць вучняў: іх у Камілы не павінна было быць больш як дзесяць [6, л. 333–334]. Школа ўтрымлівалася на сродкі сям'і В. Дуніна-Марцінкевіча. Там настаўнічала і другая дачка пісьменніка – Мальвіна. Навучанню дзяцей сёстры аддавалі ўвесь вольны час.

У мястэчку пад школу, арганізаваную Камілай, частку свайго дома аддаў адстаўны салдат. Заняткі ў ёй наведвалі дзеці бедных рамеснікаў і сялян. Захаваўся ліст жонкі Дуніна-Марцінкевіча на імя віленскага генерал-губернатара, па змесце якога можна меркаваць аб адносінах царскіх улад да асветніцкай дзейнасці яе дачкі: «Дачка мая, Каміла Марцінкевіч, за тое, за што не толькі ад асвечанай Еўропы, але нават ад дзікіх гуронаў атрымала б падзяку, а менавіта, што час вольны ад працы, якая прыносіць ёй карысць, скарыстоўвала, каб вучыць чытанню і катэхізісу дзяцей рамеснікаў і сялян <...> за гэта менавіта пасаджана ў Мінскі астрог» [3, л. 21]. Зачэпкай для закрыцця школы з'явілася службовая запіска мінскаму губернатару Кажэўнікаву аднаго з афіцэраў расквартараванай у мястэчку роты расійскіх салдат. У ёй паведамлялася, што Каміла рабіла спробу набыць у салдат зброю для тутэйшых рэвалюцыянераў. Было наладжана дазнанне. Следчы прыйшоў да высновы, што «... адкрыццё вучылішча было толькі прычынай, каб <...> зблізіцца з сялянамі, маючы прыстойны адвод і магчымасць хаваць свае шкодныя і непрыстойныя сувязі з сялянамі» [8, с. 189]. Настаўніца была арыштавана, а школа зачынена. Справа ў тым, што яшчэ раней мінская паліцыя завяла на дзяўчыну справу па абвінавачванні ў рэвалюцыйнай дзейнасці.

## Удзел у нацыянальна-вызваленчым руху

Светапогляд і ідэйныя перакананні Камілы фарміраваліся ў перыяд узмацнення беларускага вызваленча-дэмакратычнага руху, прадстаўнікі якога выступалі супраць асіміляцыі беларусаў, якую ажыццяўлялі тагачасныя расійскія ўлады. Канчатковае афармленне рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху як самастойнай ідэалагічнай плыні грамадска-палітычнай і культуразнаўчай думкі адбылося падчас паўстання 1863–1864 гг. У агульны працэс этнакультурнай кансалідацыі ўключыліся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і яго аднадумцы. Сярод іх аказалася і дачка пісьменніка Каміла. Беларускія навукоўцы даследавалі яе грамадска-палітычную дзейнасць у кантэксце барацьбы В. Дуніна-Марцінкевіча за фарміраванне нацыянальнай самастойнасці беларускага народа (напрыклад, Г. В. Кісялёў у нарысе «В. Дунін-Марцінкевіч і паўстанне 1863 года») [8]. А ўдзельнік мінскай патрыятычнай арганізацыі В. Валадзько адзначаў адметнае месца Камілы сярод жанчын, што ўдзельнічалі ў нацыянальна-вызваленчым руху. У яе гасцінным салоне напярэдадні паўстання часта збіраліся патрыятычна настроеныя мінскія гурткоўцы, вялі вольналюбівыя гутаркі. Г. Кісялёў піша, што «прапаведваючы, аж да экзальтацыі, самыя прагрэсіўныя прынцыпы, валодаючы самым лепшым сэрцам і высокай маральнасцю, яна была непараўнальным сябрам і пры тым, маючы мужчынскую адвагу, увасобіла тыя сілу і энтузіязм, сляды якіх хаваліся ў традыцыях мясцовых пачуццяў» [8, с. 152].

У 1861 г. у Мінску пачаліся дэмакратычныя дэманстрацыі, іх удзельнікі спявалі беларускія гімны. Як музыкант Каміла з энтузіязмам развучвае і спявае з моладдзю тэксты і мелодыі рэвалюцыйных гімнаў. Мінскія ўлады даносілі віленскаму ваеннаму губернатару, што «Камила

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Марцинкевич в самом начале появления революционного гимна выказала особое сочувствие, участвуя в пении оного» [3, л. 5]. За ўдзел у нацыянальна-вызваленчых дэманстрацыях на патрыётку заводзіцца крымінальная справа. На допыце Каміла заявіла, што спявала гімны і насіла жалобу па забітых у Варшаве рэвалюцыянерах. Улады вырашылі ізаляваць патрыётку ад грамадскасці, змясціўшы ў бальніцу для псіхічна хворых. Гэты гвалтоўны акт выклікаў абурэнне ў многіх гараджан. Некалькі дзён каля будынка бальніцы працягваліся дэманстрацыі пратэсту. Рэпрэсіўныя ўлады не чакалі такой рэакцыі мінчан і, каб супакоіць грамадскасць, вымушаны былі вызваліць Камілу Марцінкевіч з псіхіятрычнай бальніцы, узяўшы ад яе абяцанне не пакідаць межы Мінскай губерні і спыніць прапагандысцкую дзейнасць. Але арышт не запалохаў мужную дзяўчыну. Зімой 1862 г. праз Мінск павялі па этапе ў Сібір польскіх патрыётаў. Каміла ўсяляк імкнецца падтрымаць іх маральна і матэрыяльна. У архіве захаваўся тагачасны рапарт аднаго мінскага паліцэйскага чына: «Дзяўчына Каміла Марцінкевіч прывезла кухарку і правізію, варыла, пякла са здзіўляльнай стараннасцю, але пад каравулам, прынесла і піражнае з цукровым надпісам «Чэсць вам!» [8, с. 158]. Такіх сустрэч з пачастункамі для зняволеных польскіх патрыётаў зімой 1862 г. у Камілы Марцінкевіч, як сведчаць рапарты паліцэйскіх чыноў, было некалькі.

Падчас паўстання 1863–1864 гг. Каміла апынулася ў Мінскім астрозе (туды яе пасадзілі па абвінавачванні, як мы ўжо пісалі, у набыцці зброі ў м. Гарадок). Маці прасіла дачку напісаць прашэнне аб памілаванні віленскаму генерал-губернатару У. І. Назімаву, аднак бясстрашная патрыётка катэгарычна адмовілася. Тады прашэнне напісала сама маці, Марыя Гружэўская. Аднак генерал-губернатар паставіў на прашэнні рэзалюцыю: «Пакінуць без выніку». Адначасова з Каміліай у турме знаходзілася шмат членаў мінскай рэвалюцыйнай арганізацыі, у тым ліку і блізкі сябра дзяўчыны Карл Станкевіч. Вязні сумелі ў астрожных умовах наладзіць перапіску. У лістах яны маральна падтрымлівалі адзін аднаго. Так, Каміла звярталася да Карла са словамі: «Прашу цябе, не падай духам. Люблю цябе вельмі» [8, с. 170]. Вельмі пяшчотнымі былі і лісты Карла да Камілы: «Думаю пра цябе, дарагая Камілія! Клапачуся і непакоюся, што там з табой робіцца, гавару з табой, нібыта ты была тут, са мною» [6, л. 312].

Паўгода вялося дазнанне па абвінавачванні Камілы Марцінкевіч, але так ніякага прысуду вынесена не было. Суровыя ўмовы астрога падарвалі фізічнае здароўе адважнай патрыёткі. З просьбай паскорыць следства і вынесці якое-небудзь рашэнне зняволеная звярнулася 30 ліпеня 1863 г. да віленскага генерал-губернатара Мураўёва, дзе, у прыватнасці, былі радкі: «Сапраўды, гэты арышт на працягу такога доўгага часу забраў у мяне ўсе сродкі да існавання, праз яго я згубіла здароўе, нарэшце, я засталася без фізічных сіл» [8, с. 178]. Нарэшце 24 жніўня Мураўёў прыняў рашэнне: «Выслаць Камілу Марцінкевіч як жанчыну шкодную і зусім нядобранадзейную ў палітычных адносінах на пражыванне пад строгі паліцэйскі нагляд у Пермскую губерню» [4, л. 25].

Аднак ніякія рэпрэсіўныя меры не маглі маральна зламаць, запалохаць мужную дзяўчыну. У жніўні таго ж года яна з акна сваёй камеры кідае букет кветак паўстанцу Івану Жмачынскаму, асуджанаму на пакаранне смерцю. Гэты смелы ўчынак паскорыў высылку Камілы з Мінска. На допыце гордая патрыётка рашуча заявіла паліцэйскім: «Сапраўды, я кінула злачынцу, які ішоў на смерць, некалькі кветак. Зрабіла гэта я, як зрабіла б для кожнага, хто ідзе на смерць» [5, л. 191].

Нельга без захаплення чытаць развітальны ліст Камілы, які ёй удалося пераслаць з астрога сваёй сяброўцы Марыі Станкевіч: «...развітваюся з табою, мая Марынка! Пацалуй за мяне ручкі тваёй маткі. Развітайся за мяне з усімі маімі знаёмымі». У лісце Каміла просіць Марыю дапамагчы аднаму беднаму вязню: «Таксама збяры па знаёмых дамах для Гардзіеўскага: ён бедны, не мае ні цукру, ні гарбаты, ні грошай» [7, л. 160]. У такі цяжкі для самой сябе час гэтая незвычайная дзяўчына дбае не пра ўласны дабрабыт, а пра сваіх аднадумцаў, імкнецца палегчыць ім астрожнае жыццё.

## Ссылка і вяртанне

28 жніўня Камілу адправілі ў Вільню, а адтуль па этапе даставілі ў Пермскую губерню. Пасялілі асуджаную ў Салікамску, дзе знаходзіліся многія ўдзельнікі паўстання. Гэты перыяд жыцця дачкі В. Дуніна-Марцінкевіча амаль не даследаваны. Можна толькі меркаваць, што і ў ссылцы яна вяла асветніцкую дзейнасць, падтрымлівала сувязь з асуджанымі рэвалюцыянерамі. Там жа Каміла сустрэла сваё жаночае шчасце – пазнаёмілася з паўтовым урачом Казімірам Асіповічам, аднадумцам, рамантыкам па натуры. Ва ўмовах суровага паліцэйскага нагляду маладыя людзі вялі асветніцкія гутаркі з мясцовым насельніцтвам, па магчымасці закранаючы і сацыяльна-палітычныя пытанні. Неўзабаве сяброўства перарасло ў сапраўднае каханне. Казімр прапанаваў Каміле стаць яго жонкай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзяўчына адказала згодай. Але на шляху да сямейнага шчасця была перашкода: зняволеным трэба было атрымаць ад улад дазвол на шлюб. Не без пэўных цяжкасцей гэта ўдалося зрабіць. У выніку Каміла выйшла замуж за Казіміра, прыняўшы прозвішча Асіповіч.

У Сібіры наша суайчынніца правяла доўгія 17 гадоў. Сваю любімую Бацькаўшчыну Каміла, ужо Асіповіч, убачыла толькі ў 1880 г. Усяго пяць гадоў пражыла яна на радзіме. Цяжкія выпрабаванні падарвалі здароўе Камілы, і ў 1885 г. яна пайшла з жыцця. Аднак памяць пра яе жывая і сёння. Разам з тым хочацца, каб лёс гэтай таленавітай, высакароднай, мужнай жанчыны зацікавіў не толькі навукоўцаў, але і педагогаў-практыкаў. Думаецца, менавіта такі матэрыял дапаможа арганізаваць работу па грамадзянска-патрыятычным выхаванні на сучасным узроўні – захапляюча, доказна, эфектыўна.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Багадзяж, М.** Каміла Марцінкевіч / М. Багадзяж // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭН, 1999. – С. 81.
2. **Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы**. – Ф. 378. – Агульны аддзел. – Спр. 93, л. 3–4.
3. **Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы**. – Ф. 378. – Паліт. аддзел. – Спр. 78, л. 5.
4. **Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы**. – Ф. 378. – Паліт. аддзел. – Спр. 78, л. 25.
5. **Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы.** – Ф. 494. – Вопіс 1. – Спр. 121, л. 191.
6. **Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы**. – Ф. 1248. – Вопіс 2. – Спр. 939-а.
7. **Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы**. – Ф. 1248. – Вопіс 2. – Спр. 492, л. 160.
8. **Кісялёў, Г.** Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячоў рэвалюцыйнага руху 1863 года / Г. Кісялёў; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск: Медысонт, 2009. – 544 с.
9. **Літаратура Беларусі XIX стагоддзя**: анталогія / укл.: К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч, навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – С. 379–430.
10. **Plug, A.** Moniuszko w Mińsku / A. Plug // Tygodnik ilustrowany. – 1869. – № 19. – S. 374.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Віншавальная паштоўка

Першаснае (II ст. да н. э.) значэнне слова «культура» – апрацоўка. Пазнейшыя часы папоўнілі яго дадатковымі сэнсамі – выхаванне, адукацыя, развіццё, шанаванне. Заснавальнік школы беларускай культуралогіі Аляксандр Іванавіч Смолік арганічна і паўнавартасна аб'яднаў сваёй дейнасцю ўсе гэтыя сэнсы. Ён – аўтар першай у Беларусі доктарскай дысертацыі па тэорыі і гісторыі культуры, манаграфій «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» і «Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць», шэрага кніг і вучэбных дапаможнікаў.

З'яўляючыся прарэктарам па вучэбнай рабоце, а потым першым прарэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Аляксандр Іванавіч непасрэдна ўдзельнічаў у стварэнні новых факультэтаў і кафедраў, стаў ініцыятарам адкрыцця спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя культуры».

Прафесар, доктар культуралогіі А. І. Смолік – не толькі апантаны вучоны і таленавіты арганізатар. Яго шматгадовае настойлівае даследаванне жыцця і дзейнасці выдатных асоб беларускай культуры мінулых стагоддзяў – І. К. Кандрацьева, І. А. Гашкевіча, графаў Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, А. М. Янушкевіча, Міхаіла Гузікава, Камілы Асіповіч і інш. – матэрыялізавалася ў навукова-папулярныя кнігі і артыкулы, а таксама ў міжнародныя Кандрацьеўскія і Тышкевіцкія чытанні, ініцыятарам якіх стаў Аляксандр Іванавіч. Адным з аспектаў гэтай самаадданай асветніцкай дзейнасці прафесара Смоліка з'яўляецца яго аўтарская рубрыка «Славутыя суайчыннікі» ў нашым часопісе.

«Народная асвета» шчыра віншуе Аляксандра Іванавіча з сямідзесяцігоддзем. Жадае шчасця, долі, хлеба ўволю! З нецярплівасцю чакаем новых артыкулаў!